**БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ**

1. Гапоненка, І. Беларуская каляровая тапанімія (на фоне сусветнай) / І. Гапоненка // Роднае слова. – № 5. – 2018. – С. 30-33.
2. Никонов, В.А. Краткий топонимический словарь/ В.А.Никонов. – М., 1966.
3. Розен, Е.В. Немецкая лексика: история и современность: Учеб. пособие. – М.: Высш. in к., 1991. – 96с.
4. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 3. Г – І / [Р.У. Краўчук [і інш.]; рэдактар В.У. Мартынаў]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 408 с.

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ КАЛЯНДАРНАЯ АБРАДНАСЦЬ ЯК ФЕНОМЕН САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

# BELARUSIAN FOLK CALENDAR RITES AS A PHENOMENON OF SOCIO-CULTURAL COMMUNICATION

***Т. Рабец***

***T. Rabets***

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
Мінск, Беларусь
Belarusian State University of Culture and Arts
Minsk, Belarus
*e-mail: rabez72@mail.ru*

В статье дана характеристика особенностей современного функционирования белорусской народной календарной обрядности, определены место и роль народного календаря при передаче культурной памяти народа, сохранении системы ценностей и норм поведения в обществе.

The article characterizes the features of the modern functioning of the Belarusian people's calendar, defines the place and role of the people's calendar in the transfer of cultural memory of the people, the preservation of the system of values and norms of behavior in society.

*Ключевые слова:* белорусский народный календарь; традиционные народные праздники; обряды и обычаи; этническая культура Беларуси.

*Keywords:* Belarusian folk calendar; traditional folk holidays; rituals and customs; ethnic culture of Belarus.

Народная каляндарная абраднасць як феномен сацыякультурнай камунікацыі ў апошнія дзесяцігоддзі прыцягвае ўвагу даследчыкаў самых розных галін гуманітарных ведаў: культуролагаў, сацыёлагаў, філосафаў, этнографаў, фалькларыстаў, гісторыкаў і інш. У святочнай культуры, прымеркаванай да народнага календара, як нідзе лепш знаходзяць сваё адлюстраванне сістэма каштоўнасцей, нормаў

паводзінаў у грамадстве, культурных узораў, якія нягледзячы на пастаянна змяняючыюся сацыяльна-культурную сітуацыю забяспечваюць перманентную актуальнасць традыцыйнай народнай культуры.

Канец XX – пачатак XXI стагоддзяў сталі прынцыпова складанымі і супярэчлівымі ў гісторыі беларускага народа. Ва ўмовах глабалізацыі, мадэрнізацыі і інфарматызацыі грамадства, а таксама ў сувязі з актыўным развіццём працэсаў урбанізацыі, вялікім адтокам насельніцтва з сельскай мясцовасці, апусценнем вёсак і знікненнем з жыцця сельскага насельніцтва элементаў традыцыйнага культурнага комплексу адбыліся кардынальныя змены ў сацыяльным і культурным жыцці беларускага народа. Карэнныя грамадскія пераўтварэнні, якія ўзнікаюць сёння пад уздзеяннем дадзеных фактараў, актуалізуюць праблему перагляду поглядаў на традыцыйную культуру Беларусі, якая акумулюе ў сабе гістарычны вопыт эканомікі краіны, правасвядомасці, мастацтва, вынікі развіцця маральнасці, навукі і адыгрывае велізарную ролю ў супрацьстаянні выклікам глабалізацыі. Шматлікія кампаненты традыцыйнай культуры носяць агульначалавечы характар і тым самым дазваляюць падтрымліваць паразуменне паміж рознымі народамі, супрацьдзейнічаць этнічнай і рэлігійнай нянавісці, гвалту, сепаратызму і іншым формам экстрэмізму.

Акрамя таго, неабходна заўважыць, што традыцыйная народная культура мінулага ўніверсальная. На працягу стагоддзяў яна вызначала і нармавала ўсе аспекты жыццядзейнасці грамадства: уклад жыцця, формы гаспадарчай дзейнасці, звычаі, абрады, сацыяльныя узаемаадносіны членаў супольнасці, тып сям'і, асаблівасці выхавання дзяцей, спецыфіку жылля, адзежы, сілкавання, спосаб засваення навакольнага асяроддзя, характар адносінаў з прыродай, светам, вераванні, навуковыя веды, мову, фальклор і г.д. Такім чынам, традыцыйную культуру можна прадставіць у выглядзе складанай дынамічнай сістэмы, якая выконвае мноства функцый, неабходных для паўнавартаснага развіцця сучаснага грамадства: сацыяльнай, пазнавальнай, рытуальнай, этычнай, эстэтычнай, нарматыўнай, інфарматыўнай, камунікатыўнай, выхаваўчай, што арганізуе, этыкетнай і інш.

У апошні час у Беларусі назіраецца прыкметны рост цікавасці да традыцыйных каштоўнасцяў – духоўных, сямейных, рэлігійных, што дазваляе даследчыкам ахарактарызаваць дадзеную сітуацыю як культурнае адраджэнне. Адной з праблем, якая ва ўмовах глабалізацыі становіцца дамінантнай, з'яўляецца праблема захавання нацыянальнай ідэнтычнасці. Менавіта традыцыйныя нацыянальныя святы, абрады і звычаі з'яўляюцца ядром этнічнай культуры беларусаў, якая выступае ў

ролі механізму, што рэгулюе сацыяльныя адносіны ў грамадстве, садзейнічае фарміраванню фундаментальных структур маральнасці і духоўных каштоўнасцяў асобы і соцыума ў цэлым. У сувязі з гэтым рэканструкцыя этнагісторыі і этнакультуры на аснове жывых праяў традыцыйнай культуры ў сучасным жыцці, а таксама архіўных дадзеных набывае вялікае значэнне ў духоўным адраджэнні грамадства. Але, нажаль, з кожным годам вырашаць гэту задачу становіцца ўсё цяжэй і цяжэй, бо хутка сыходзяць з жыцця людзі старэйшага пакалення – носьбіты культуры, якія не толькі захавалі ў памяці інфармацыю пра старадаўнія звычаі і абрады, але і самі падпарадкоўвалі сваё жыццё законам своеасаблівай укладнасці жыццёвага цыклу.

Сучасны стан беларускай традыцыйнай культуры пацвярджае агульную тэндэнцыю паступовага згасання народнай традыцыі, прыўнясенне ў яе новых, не характэрных для традыцыйнага ўкладу жыцця беларускага народа, элементаў. Аднак, варта адзначыць, што народная абраднасць не знікла зусім і, функцыянуючы эпізадычна, працягвае захоўвацца ў пасіўнай памяці народа. Галоўным чынам, найвялікай устойлівасцю характарызуюцца апісанні абрадаў, у той час як музычны, вербальны і рэчытатыўны матэрыял практычна забываецца. Фальклор, запісаны ў апошнія дзесяцігоддзі, пераважна прадстаўлены ў другаснай форме існавання, калі шматлікія яго жанры, асабліва абрадавай сферы, або спынілі існаванне, або змянілі сваю функцыянальнасць.

Вялікую цікавасць у плане выяўлення сучаснага стану і ступені захаванасці традыцыйнай формы і зместу культуры Беларусі выклікаюць абрадавыя комплексы, злучаныя з народным календаром. У цэлым каляндарная сістэма Беларусі ўяўляе сабою сінтэз нацыянальных святочных традыцый, прыродна-гаспадарчых і хрысціянскіх календароў, дзяржаўных і прафесійных свят. Так, для сучаснага беларуса сёння аднолькава важна адзначыць такія святы, як Каляды і Новы год, Вялікдзень і 8 Сакавіка, Спас і Дажынкі, Дзень святога Георгія (Юр'еў дзень) і 1 Мая і г.д. Аднак пры ўсёй значнасці і раўнацэннасці ўсіх складнікаў сучаснага беларускага календара назіраецца перавага менавіта ў бок хрысціянскіх свят. У выніку складанага спалучэння, узаемадзеяння, узаемапранікнення дзвюх сістэм светапогляду – дахрысціянскай і хрысціянскай – у сучаснай Беларусі функцыянуе народны каляндар свят і абрадаў, часавая прымеркаванасць якога вызначаецца царкоўна-хрысціянскім календаром. Некаторыя каляндарныя святы маюць нязменную дату правядзення, іншыя – так званыя рухомыя – адзначаюцца ў залежнасці ад даты правядзення Вялікдня і знаходзяцца на вызначанай часавай адлегласці ад Вялікдня (перад святам або пас-

ля яго). Кожны год яны сінхронна перасоўваюцца ў залежнасці ад даты правядзення Вялікдня. Нягледзячы на дамінантную ролю хрысціянскай традыцыі, можна заўважыць, што ў аснове беларускага народнага календара ляжыць салярны культ. Чатыры найважныя каляндарныя святы прымеркаваны да чатырох этапаў (фаз) у руху Сонца на небасхіле: два з іх – Каляды і Купалле – прыходзяцца на зімовае і летняе сонцастаянне, а Ярыла і Багач адзначаюцца ў перыяд вясновага і восеньскага раўнадзенства. Акрамя таго, паміж гэтымі фазамі вылучаюцца яшчэ чатыры пераходных этапа, якім адпавядаюць святы Масленіца, Сёмуха, Дажынкі і Дзяды.

З 988 г. у сувязі з актыўным распаўсюджаннем на ўсходнеславянскіх землях хрысціянскай рэлігіі на народныя святы, заснаваныя на салярным кульце, сталі накладвацца хрысціянскія: Нараджэнне Хрыста прыйшлося на дзень нараджэння Бога Сонца, дзень вясновага адраджэння Сонца супаў з днём уваскрэсення Хрыста, на наступны дзень пасля найстаражытнейшага свята Купалля стаў шанавацца Іван Хрысціцель, да летняй пары было прымеркавана двухтыднёвае святкаванне трох Спасаў, а позняй восенню беларусы з асаблівай урачыстасцю сталі адзначаць свята Дзяды.

Вызначэнне часу святкавання Новага года ў Беларусі таксама з'яўляецца надзвычай цікавым і складаным пытаннем. Вядома, што ва ўсходнеславянскіх народаў да 1343 г. першым месяцам года быў сакавік. З 1343 г. па прыкладзе Александрыйскай Царквы новы год пачынаўся ў верасні. Што датычыцца менавіта Беларусі, то тут у XIV ст. пачатак года ў розных рэгіёнах не супадаў. Тая тэрыторыя, якая ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітыя, з 1364 г. святкавала нараджэнне года 1 студзеня. Ва ўсходняй частцы Беларусі год пачынаўся з 1 сакавіка, а затым з 1493 па 1700 г. у адпаведнасці з Візантыйскай царкоўнай традыцыяй – з 1 верасня: з дня восеньскага раўнадзенства і адпаведна са дня нараджэння Багародзіцы. Аднак, «кніжны», царкоўны варыянт летазлічэння не атрымаў належнай падтрымкі з боку простага народа і менавіта час вясновага раўнадзенства доўгі час па-ранейшаму заставаўся пачаткам года, што, у сваю чаргу, знайшло адлюстраванне ў валачобных песнях, дзе прыводзіцца разгорнутае апісанне земляробчага календара, паводле якога першым святам года з'ўляліся Сарокі:

*На тым яворы стаіць крэсла залатое.*
*На тым крэсле сам Бог сядзіць.*
*Каля го служкі яго шыкуюцца, рахуюцца,*
*Катораму святцу упярод стаці.*
*Перша свята – Нова лета.*
*Святы ізбор упярод ступіў, ваду пусціў.*

*Святы Казімір дровы сячэць, клады кладзець.*
*Благавешчанне жытцо рушыць, зямлю сушыць.*
*Свята вербніца сошкі правіць.*
*Чысты чацвер заворываіць…*
*Святы вялікдзень разгаўляіць,*
*Красным яечкам старых, малых забаўляіць.*
*Радаўніца барануіць чыстае поле яравое да й раўнуіць…* [1, с. 167].

Пасля 1700 г. згодна загаду Пятра I Новы год стаў адзначацца 1 студзеня. З 14 лютага 1918 г. на падставе дэкрэту Саўнаркама адбылася рэформа календара. З гэтага часу быў уведзены Грыгарыянскі каляндар, заснаваны ў 1582 годзе. Гэта каляндар новага стылю, паводле якога дата, якая ішла за 31 студзенем, стала не 1, а 14 лютага. Святы народнага календара ў Беларусі сярод праваслаўных сталі адзначацца паводле новага стылю, а сярод каталікоў – па старым стылі.

Абрадавыя комплексы, злучаныя з народнымі святамі, з'яўляюцца своеасаблівым ядром: калядны – зімовага, а купальскі – летняга цыклаў. У цэлым беларускі гаспадарчы каляндар адпаведна порам года і вытворчым сезонам, якія залежалі ад іх, меў чатыры цыкла. У адпаведнасці з імі і гадавыя святы падзяляліся на зімовыя, вясновыя, летнія і восеньскія. Вясновы абрадава-песенны цыкл суадносіўся з перыядам вясновых палявых прац і ўключаў абрады праваду зімы і сустрэчы вясны (Масленіцу, Саракі), а таксама святы: Благавешчанне (7 красавіка), Вялікдзень з абыходам двароў валачобнікамі, Ягорый (Юр’е) (6 мая) – дзень першага выгану скаціны на пашу, Радаўніцу (аўторак тыдня Фамы) – свята памінання продкаў, Сёмуху (сёмы тыдзень пасля Вялікдня) – свята заканчэння вясновых палявых прац. Летні каляндарна-абрадавы цыкл акрамя купальскай абраднасці характарызаваўся абрадамі зажынак і дажынак, накіраваных на паспяховы збор ураджаю і забеспячэнне ўрадлівасці і дабрабыту сям'і на будучы год. Асноўныя аграрныя святы восеньскай пары: Багач (21 верасня, *іншыя найменні:* Асяніны, Другая Прачыстая, Спожка) – свята ўраджая, Уздзвіджанне (27 верасня, *царкоўн.* Свята Ўзвіжання Крыжа Господняга), Пакровы (14 кастрычніка, *царкоўн.* Полаг Найсвяцейшай Багародзіцы) – свята заканчэння палявых прац, Дзмітрыеўскія Дзяды / Дзмітрыеўская бацькоўская субота (субота перад днём памяці вялікапакутніка Зміцера Салунскага) – свята памінання продкаў. Галоўная ідэя правядзення каляндарных свят і абрадаў – падтрыманне і магічнае стымуляванне прыроднага пачатку. Акрамя таго, каляндарна-абрадавыя комплексы насілі прыкладны, прагматычны характар. Яны павінны былі спрыяць земляробу ў працы, паўплываць на ўраджайнасць яго нівы, абараніць яго гаспадарку ад прыродных катаклізмаў,

садзейнічаць здароўю і працягу роду, росту дабрабыту сям'і, шчасліваму лёсу.

У сувязі з тым, што святкаванне Новага года пераносілася з адной пары на іншую, у беларусаў склалася два функцыянальна блізкіх абрадавых комплекса: калядныя абыходы на Каляды і валачобныя абыходы на Вялікдзень. Аднак тэрытарыяльна валачобныя абрады размяжоўваюцца з каляднымі па прынцыпе ўзаемавыключэння: там, дзе распаўсюджаны валачобны абрад, рэдка сустракаецца або цалкам адсутнічае каледаванне. Класічныя ўзоры валачобных абрадаў зафіксаваны пераважна ў паўночнай, паўночна-заходняй і цэнтральнай частках Беларусі, што супадае з арэалам цывілізацыі крывічаў, а дакладней з тэрыторыяй Полацкага княства.

На сучасным этапе беларускі народны каляндар характарызуецца аб'яднаннем двух пачаткаў: царкоўна-хрысціянскага календара, які з'яўляецца асноўным стрыжнем структуравання каляндарнага года, і ўласна народных абрадаў, звычаяў, прыкмет і вераванняў, якія суправаджаюць гэты каляндар. У апошнія гады на тэрыторыі Беларусі назіраецца актыўны працэс актывізацыі менавіта хрысціянскага кампанента каляндарнай абраднасці, у сувязі з чым хрысціянскія святы ўсё больш прыцягваюць увагу людзей усіх пакаленняў і рознай ступені рэлігійнасці. У побыце не толькі сельскіх жыхароў, але і гараджан нярэдка можна сустрэць рытуальныя хрысціянскія атрыбуты: вадохрышчанскую ці купальскую ваду, грамнічныя свечкі, галінкі вярбы і інш. Гэтыя прадметы выконваюць ахоўную і лячэбную функцыі і выкарыстоўваюцца ў розных крытычных жыццёвых сітуацыях.

Супастаўляючы традыцыйную і сучасную мадэлі каляндарных свят, можна заўважыць працэс дэсакралізацыі і пераўтварэння свят у масавая забаўляльныя мерапрыемствы. Істотна трансфармавалася сімвалічная сутнасць рытуалу: замест выразнай аграрнай скіраванасці абрадаў на першае месца выступае асабістая матывацыя ўдзелу ў каляндарным абрадзе, г.зн. «для сябе», для ўласнай асалоды ці асабістых патрэб. Змена каляндарнай абраднасці ў першую чаргу адбілася на скарачэнні вызначаных фрагментаў абраду, змене і нават знікненні тэкстаў абрадавай паэзіі, змене полаўзроставай структуры ўдзельнікаў, абрадавай атрыбутыкі і рэквізіту, гукавога фону, часавай і прасторавай прымеркаванасці, сцэнарыя і г.д. «Карэляцыя "старое/новае" ў народных абрадах выяўляецца ў трох асноўных кірунках: паступова змяняецца форма з прычыны падмены атрыбутыўных кампанентаў абраду на сучасныя, змяняецца змест, нараджаецца новая паэтыка-міфалагічная падаплёка абраду, новая сімволіка, трансфармуюцца

адначасова і форма, і змест, і часавыя каноны, што вядзе, па сутнасці, да нараджэння новай з'явы» [2, с. 108].

Згасанне народных традыцый у іх аўтэнтычным існаванні з'яўляецца аб'ектыўнай гістарычнай дадзенасцю. Не толькі з актыву культуры, але і з калектыўнай этнічнай памяці ў апошнія дзесяцігоддзі сышлі формы і з'явы, якія выконваюць прэзентацыйную функцыю рэгіянальнай культуры: вясельныя песні і галашэнні, абрадава-святочныя комплексы і іх кампаненты, цэлы шэраг мастацкіх рамесных традыцый і прамысловых тэхналогій. Тым не менш, народныя традыцыі сёння актуальныя і жыццёва неабходны грамадству па-за залежнасцю ад ступені захаванасці і натуральных умоў іх існавання. Так, напрыклад, у цяперашні час у Беларусі на фоне агульнай тэндэнцыі адраджэння народнай традыцыйнай культуры павялічваецца колькасць маладзёжных і дзіцячых фальклорных калектываў, а таксама творчых аб'яднанняў, інтарэсы якіх сканцэнтраваны на захаванні і папулярызацыі традыцыйнай культуры беларускага народа. У апошнія гады ў розных гарадах Беларусі прайшла вялікая колькасць фальклорных свят, асноўнымі задачамі якіх з'яўляюцца адраджэнне духоўнасці беларускага народа праз далучэнне да культурных і духоўных каштоўнасцяў, азнаямленне з непаўторнай архітэктурай і культурай роднага краю, вывучэнне яго традыцый і гісторыі, арганізацыю актыўнай культурнай дзейнасці.

Папулярызацыі і пераемнасці аўтэнтычных формаў фальклору спрыяюць таксама рэгіянальныя агляды-конкурсы фальклорнага мастацтва дзяцей, падлеткаў і моладзі. Акрамя таго, шматлікія фальклорныя ансамблі прадстаўляюць гледачам рэканструяваныя каляндарныя святы, якія суправаджаюцца масавымі гуляннямі, накіраванымі на стварэнне святочнай атмасферы. Пры гэтым варта адзначыць, што, як правіла, пры падрыхтоўцы свят арганізатары абапіраюцца на мясцовыя лакальныя традыцыі, акцэнтуюць увагу на выкарыстанні найбольш выйгрышных у эстэтычным плане элементаў адпаведных абрадаў, якія становяцца знакамі таго ці іншага каляндарнага свята. Напрыклад, на Масленіцу адбываліся спальванне пудзіла Масленіцы, катанне на канях і пачастунак удзельнікаў мерапрыемства блінамі, а на Вялікдзень здзяйсняліся валачобныя абыходы двароў аднавяскоўцаў і гульні з велікоднымі яйкамі, на Сёмуху упрыгожвалі зялянінай хаты, на Купалле займаліся пляценнем вянкоў, раскладаннем купальскага вогнішча, вакол якога вадзілі карагоды. Падчас правядзення такіх свят удзельнікі фальклорных груп выконвалі абрадавыя песні і іншыя жанры фальклору. У шэрагу выпадкаў арганізатары каляндарных свят для прыцягнення ўвагі

гледачоў і турыстаў ствараюць лакальны «брэнд»: гэта датычыцца ў першую чаргу абрадаў, якія атрымалі статут гісторыка-культурнай нематэрыяльнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, напрыклад, абрады «Калядныя цары» (в. Семежево), «Жаніцьба Цярэшкі» (в. Аношкі), «Тураўскі карагод» (в. Цвінтар), "Ваджэнне і пахаванне стралы" (вв. Болсуны, Столбун), «Бразгун» (в.Норкі) і інш.

Такім чынам, сабраны беларускімі фальклярыстамі і этнографамі на тэрыторыі Беларусі фальклорна-этнаграфічны матэрыял пацвярджае асаблівы характар існавання і захаванні ў народнай памяці каляндарных абрадаў і звязаных з імі народных вераванняў. Вылучаныя вышэй рысы сучаснага стану і развіцці каляндарнай абраднасці ў розных раёнах Беларусі выяўляюцца з рознай ступенню інтэнсіўнасці і захаванасці традыцыйнай формы правядзення, на што паўплываў дэмаграфічны стан вёскі і яе полаўзроставая структура, а таксама фактары культурнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Валачобныя песні / склад. Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
2. Власова, Г.И. Обрядовый фольклор восточных славян Казахстана (на материале записей XX века). – Ч. 1: Календарная обрядность и поэзия. – Астана: ЕНУ им. Л.Н. Гумилева, 2005. – 342 с.

# СТИЛЕВЫЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ ЯЗЫКА ЭКОЛОГИЧЕСКОГО ДИСКУРСА

# STYLISTICS OF ECOLOGICAL DISCOURSE LANGUAGE

***О.А. Рипинская***

***O.A. Ripisnkaya***

Белорусский государственный университет
Минск, Беларусь
Belarusian State University
Minsk, Belarus
*e-mail: thepankiot@gmail.com*

Статья посвящена исследованию кинотекста документального фильма «Одиннадцатый час», затрагивающего проблемы роста экологических катастроф и связанные с этим социальные проблемы. В ходе изучения данного фильма мы выявили отдельный тип дискурса – экологический, ранее не отмечены в классификациях, а также определили его характерные черты. Экологический дискурс, рассматриваемый в данной статье, обладает стилевыми характеристиками, что позволяет утверждать о его автономном статусе.